Славутыя суайчыннікі

# КАНСТАНЦІН ЕЛЬСКІ: ЗМАГАР ЗА СВАБОДУ, ПАДАРОЖНІК, ВУЧОНЫ

## Жыццё, адданае служэнню навуцы



**А. І. Смолік,**
загадчык кафедры культуралогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры
і мастацтваў, доктар культуралогіі, прафесар



**Л. К. Кухто,**
прафесар кафедры культуралогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і
мастацтваў, кандыдат культуралогіі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Не так даўно давялося наведаць музей матэрыяльнай культуры «Дудуткі». Сярод экскурсантаў былі і мінскія школьнікі. Экскурсаводы эмацыянальна распавядалі вучням аб укладзе беларускай шляхты ў эканоміку краю, дэманстравалі артэфакты паўсядзённай культуры, знаёмілі з тэхналогіямі вырабу разнастайных прадметаў гаспадаркі, запрашалі набыць сувеніры. Але на працягу ўсяго турыстычнага маршруту юныя наведвальнікі не атрымалі практычна ніякай інфармацыі пра значэнне для беларускай культуры і навукі дзейнасці прадстаўнікоў шляхецкага роду Ельскіх, якім з 1857 г. належаў маёнтак Дудзічы з наваколлем. Адказы вучняў-старшакласнікаў на нашы пытанні шчыра засмуцілі. Толькі адна дзяўчынка назвала прозвішча Аляксандра Карлавіча Ельскага. Відаць, яе настаўніца на ўроку літаратуры (шчырае дзякуй гэтаму педагогу!) расказала пра паэтычныя і празаічныя творы знакамітага ў XIX ст. пісьменніка.**

**На жаль, нават у энцыклапедычным даведніку «Мысліцелі і асветнікі Беларусі» змешчаны толькі два артыкулы: пра Міхаіла Ельскага, славутага кампазітара, скрыпача, музычнага пісьменніка, і яго брата Аляксандра Ельскага, вядомага гісторыка, этнографа, краязнаўца, пісьменніка. У даведніку не ўзгадваюцца іншыя славутыя прадстаўнікі старажытнага шляхецкага роду Вялікага Княства Літоўскага герба «Пелеш», якія займалі ў перыяд з XVI па XX ст. высокія дзяржаўныя пасады, плённа працавалі на ніве мастацтва і навукі. Так, разьбяр і скульптар Караль Ельскі ў XVII ст. аздабляў касцёлы і палацы ў Вільні, а таксама шэраг маёнткаў і манастыроў на тэрыторыі Беларусі. Адметны след у галіне станковай і манументальнай скульптуры ў XVIII–XIX стст. пакінуў прафесар Казімір Ельскі. У 1811–1826 гг. ён узначальваў кафедру скульптуры на факультэце жывапісу, скульптуры і архітэктуры Віленскага ўніверсітэта.**



**Многія з прадстаўнікоў роду Ельскіх заслугоўваюць асобных грунтоўных даследаванняў, і хочацца спадзявацца, што айчынныя гісторыкі, мастацтвазнаўцы, літаратуразнаўцы і культуролагі скіруюць свае даследчыцкія намаганні на іх культурна-асветніцкую і грамадскую дзейнасць. Мы ж са свайго боку прапануем вашай увазе артыкул пра**

**сусветна вядомага даследчыка ў галіне прыродазнаўства Канстанціна Міхайлавіча Ельскага (1837–1896 гг.).**

**У Год навукі дарэчы зазначыць, што сучасныя здабыткі беларускіх вучоных абапіраюцца на грунтоўны падмурак, закладзены іх папярэднікамі з мінулых эпох. Імёны многіх забыты. І, думаецца, надышоў час пачаць іх узгадваць і шанаваць.**

### Старажытны шляхецкі род

Род Ельскіх валодаў не толькі Дудзічамі. Яго зямельныя ўладанні размяшчаліся таксама на Гродзеншчыне і Міншчыне. Бацьку Канстанціна належыў маёнтак Ляды ў Ігуменскім павеце (цяпер Чэрвенскі раён) [4, с. 96]. Дарэчы, непадалёку месціўся фальварак славутага кампазітара Станіслава Манюшкі, з якім сям'я Ельскіх знаходзілася ў блізкіх сваяцкіх адносінах (маці Кастуся Клацільда была сястрой Станіслава Манюшкі) [6, с. 2]. Бацька будучага вучонага прытрымліваўся прагрэсіўных поглядаў і спачуваў дзеячам Рэчы Паспалітай, якія рыхтавалі ўзброенае нацыянальна-вызваленчае паўстанне 1793–1794 гг. Дзядзька Кастуся быў генералам у паўстанцкім войску.

### Гімназічныя гады

Пасля пачатковай хатняй адукацыі, як гэта было прынята ў шляхецкіх сем'ях, Канстанцін прадоўжыў адукацыю ў элітнай Мінскай гімназіі, якая на той час давала сваім выхаванцам грунтоўную рознабаковую сярэднюю адукацыю. Сярод вучэбных прадметаў значыліся гісторыя, геаграфія, філасофія, фізіка, пачартальная і аналітычная геаметрыя, статыстыка, чарчэнне, пачатковыя асновы тэхналогіі і камерцыйных навук, лацінская, польская, руская, нямецкая і французская мовы. Выпускнікі гімназіі атрымлівалі права паступлення ва ўніверсітэты і іншыя вышэйшыя ўстановы Расіі. Выхаванцамі Мінскай гімназіі былі Я. Тышкевіч (зачынальнік беларускай музеялогіі і археалогіі), С. Манюшка (славуты кампазітар), Ф. Вярэнька (краязнаўца, археолаг), Б. Дыбоўскі (прыродазнаўца, заолаг, урач), А. Ельскі (гісторык, пісьменнік), Я. Каралькевіч (мецэнат, асветнік), Т. Корзан (гісторык, публіцыст), Я. Лучына (паэт-дэмакрат), А. Марціноўскі (публіцыст, выдавец), Я. Наркевіч-Ёдка (прыродазнаўца, медык), С. Прыбытак (медык, хімік, педагог), У. Спасовіч (публіцыст, літаратуразнаўца). Такая колькасць знакамітых дзеячаў навукі і культуры з ліку выхаванцаў гімназіі яскрава сведчыць аб высокім узроўні выкладання ў ёй.

Значны ўплыў на фарміраванне навучальных інтарэсаў Канстанціна Ельскага зрабіў выкладчык прыродазнаўчых прадметаў М. Радзевіч, выпускнік Маскоўскага ўніверсітэта, асістэнт кафедры фізікі. Сябар Канстанціна па гімназіі Бенядзікт Дыбоўскі (будучы даследчык Байкала) у сваіх мемуарах пісаў, што настаўнік «...нас захапляў усебаковымі ведамі, тактоўнасцю і выдатным выкладаннем. Адразу ж пасля прыезду ў Мінск ён арганізаваў у гімназіі метэаралагічную станцыю, вучыў нас запісваць назіранні, у кабінеце фізікі мы самі рабілі розныя доследы. Радзевіч нас нават знаёміў з неабавязковымі прадметамі, напрыклад, з пачаткамі хіміі» [3, с. 145]. У многім гэтаму цудоўнаму выкладчыку сябры абавязаны і тым, што праз усё жыццё яны пранеслі цікавасць да вывучэння незнаёмых краін.

### Паміж навукай і палітыкай

Пасля заканчэння гімназіі на выдатна юнак у 1853 г. паступае на медыцынскі факультэт Маскоўскага ўніверсітэта. Праз тры гады ён пераводзіцца ў Кіеўскі ўніверсітэт, дзе вывучае батаніку, заалогію і педагогіку.

Вялікі ўплыў на студэнта Ельскага зрабілі лекцыі вядомага заолага прафесара К. Ф. Кеслера. Сумесна настаўнік і вучань даследавалі членістаногіх і малюскаў у басейнах Дняпра, Паўднёвага Буга і Днястра. Па выніках даследавання К. Ельскі выступіў з паведамленнем на Другім з'ездзе прыродазнаўцаў у Кіеве. Выступленне выклікала цікавасць навуковай грамадскасці. А неўзабаве малады заолаг атрымлівае ступень кандыдата і ўдзельнічае ў конкурсе на замяшчэнне вакантнай пасады выкладчыка Кіеўскага ўніверсітэта. Конкурсная праца Ельскага высока ацэнена прафесарамі навучальнай установы – ёй прысудзілі залаты медаль. У 1860 г. Канстанцін Міхайлавіч пачаў чытаць лекцыі студэнтам універсітэта і адначасова выкладаць прыродазнаўчыя дысцыпліны ў Кіеўскай гімназіі.

Шмат часу Ельскі аддаваў даследаванням насякомых і малюскаў. Адным з першых ён падтрымаў эвалюцыйную тэорыю Ч. Дарвіна. Канстанцін Міхайлавіч быў перакананы, што «тэорыя Дарвіна перараджэння відаў садзейнічае развіццю прыродазнаўчых навук» [2, с. 34].

1860-я гг. у Беларусі і Літве адзначаны ўздымам нацыянальна-вызваленчага руху, што было выклікана абвастрэннем сацыяльна-палітычнай сітуацыі ў Расіі і Польшчы. Кульмінацыяй гэтага працэсу стала ўзброенае паўстанне 1863–1864 гг. пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Беларускі шляхціц, выкладчык Кіеўскага ўніверсітэта Канстанцін Ельскі імкнуўся далучыць да паўстання і ўкраінцаў. Разам з прадстаўніком беларускіх паўстанцаў Бенядзіктам Дыбоўскім, пасланым у Кіеў вясной 1863 г. з мэтай фарміравання і тут паўстанцкіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУИР

атрадаў, Ельскі актыўна займаўся агітацыйнай дзейнасцю. Неўзабаве расійскім паліцэйскім удалося высачыць агітатараў, і ў горадзе пачаліся арышты. Б. Дыбоўскаму ўдалося своечасова пакінуць Украіну. К. Ельскі пад выглядам удзелу ў заалагічнай экспедыцыі па Бесарабіі праз Румынію перабраўся ў Турцыю. Два гады на берагах Дарданэл палітычны эмігрант займаецца даследаваннем карысных выкапняў, складаннем геалагічнай карты акругі Тузла.

### Сваё адкрыццё Паўднёвай Амерыкі

Змагары за незалежнасць радзімы ў выгнанні імкнуліся дапамагаць адзін аднаму. У 1865 г. сябрам удалося пераправіць К. Ельскага ў Францыю і нават уладкаваць на працу ў Парыжскі прыродазнаўчы інстытут, дзе наш суайчыннік сумесна з прафесарам Дэйролем праводзіў эксперыменты ў галіне заалогіі. Па заданні гэтай навуковай установы К. Ельскі ў 1865 г. адпраўляецца ў Гвіяну – тады французскую калонію ў Паўднёвай Амерыцы. Тут, у Кайене (цэнтр Гвіяны Французскай), 28-гадовы натураліст здабываў птушак, кажаноў, насякомых для варшаўскіх і парыжскіх заалагічных музеяў. Рэгіён Кайена знаходзіўся на востраве паміж вусцямі дзвюх рэк, і французскія ўлады выкарыстоўвалі яго тэрыторыю ў якасці зручнага месца для ссылкі на катаргу алжырцаў, якія змагаліся з каланізатарамі. У гэтай суровай мясцовасці палітвязні часта пакутавалі ад розных трапічных хвароб. К. Ельскі, які вучыўся калісьці на медыцынскім факультэце і меў пэўныя пазнанні ў медыцыне, пастаянна дапамагаў алжырскім патрыётам. У якасці вучня фармацэўта ён удзельнічаў у абходзе ўрача, гатаваў лекі, дзяжурыў у бальніцы. Пэўны час Ельскі нават замяняў урача ў бальніцы для пракажоных на гары Сярэбранай. Аплату ён атрымліваў у выглядзе бясплатнага харчавання, права карыстацца бібліятэкай, а таксама магчымасці вывучаць насякомых і кажаноў у садзе бальніцы. Мясцовыя жыхары, якіх «доктар Ельскі» бясплатна лячыў, вельмі паважалі яго і называлі добрым белым. «Аднойчы мясцовы рамеснік, – успамінаў Ельскі, – сказаў мне: «Адразу можна зразумець, што вы не мясцовы, бо размаўляеце са мной ветліва, як з чалавекам» [5, с. 153]. Удзячныя абарыгены дапамагалі вучонаму ў паляванні на акул і чарапах, папаўнялі яго калекцыі новымі экзэмплярамі раслін і жывёл. У вольны час Канстанцін Міхайлавіч выкладаў батаніку і земляробства ў мясцовай школе.

Востраў аказаўся надзвычай багатым на рэдкія біялагічныя віды, асабліва разнастайнымі былі разнавіднасці птушак. Вучоны апантана даследуе мясцовых ракаў, марскіх зорак, рознакаляровых асцыдый, паўднёваамерыканскіх птушак і інш. Адных толькі мурашак натураліст вывучыў і сабраў каля 100 відаў. Ён падрабязна апісваў «велізарных і пражорлівых белагаловых мурашак-салдат, якія харчаваліся насякомымі, мышамі, лягушкамі»; «чорных мурашак, даўжынёй у палавіну пальца, з джалам на канцы цела, укол іх быў вельмі балючы» [5, с. 107]. Удзячныя ссыльныя дапамагалі Ельскаму здабываць на рыфтавым шэльфе разнастайныя каралы (белыя, жоўтыя, чырвоныя).

Нястомны даследчык здзейсніў працяглую экспедыцыю па рэках Паўднёвай Амерыкі. Па джунглях ён падарожнічаў у суправаджэнні карэнных жыхароў Амерыкі і высока ацэньваў іх чалавечыя і паляўнічыя якасці. Ельскі шчыра лічыў іх паўнавартаснымі людзьмі, якія маюць усе правы на шчаслівае і свабоднае жыццё. «Ходзяць яны ціха і хутка, – успамінаў даследчык, – прыкмячаюць на дрэвах нават маленькіх птушак, шэрых і нерухомых, выдатна вызначаюць, які звер пакінуў след на зямлі. Умеюць яны пераймаць голас кожнага звера; у лесе могуць здабыць літаральна ўсё, бо ведаюць карысныя ўласцівасці кожнай расліны, кожнага дрэва» [5, с. 98]. З горыччу ўспрымаў Канстанцін Міхайлавіч цяжкае становішча індзейцаў: «Індзеец гіне, бо пазнае цывілізацыю праз сквапных купцоў, якія за гарэлку дастаюць усё, што індзеец можа здабыць... Гандляры з Апаяка падчас знаходжання ў вярхоўях ракі забіраюць усё, што хочуць» [5, с. 133].

У трапічных лясах падарожнікаў на кожным кроку падпільноўвала небяспека. У ліянах прытойваліся ягуары, побач з лодкай усплывалі කракадзілы. Асабліва цяжка было, успамінаў Ельскі, здабываць змей, даўжыня якіх часам дасягала сямі метраў. Былі выпадкі, калі змеі нападалі на падарожнікаў. Харчаваліся члены экспедыцыі мясам макак, папугаеў, качак, а таксама пладамі пальм, змешанымі з сухім куакам, рыбай кунані. Нягледзячы на пастаянную небяспеку, вучоны ў суправаджэнні абарыгенаў пранік у самыя аддаленыя, некранутыя чалавекам унутраныя раёны Гвіяны, атрымаў магчымасць назіраць у натуральных умовах экзатычных прадстаўнікоў фауны: зялёных папугаяў, апосумаў, кайманаў, белых цапляў і інш. На Сярэбранай гары Ельскаму пашчасціла сабраць унікальную калекцыю чырвоных ібісаў. (Падчас лоўлі іх натураліст ледзь не загінуў. Выратаваў яго ахоўнік мясцовай турмы, які выпадкова апынуўся непадалёк.) На пнях кафейных дрэў вучоны заўважыў архідэі, якія паразітавалі там. Пасля вяртання з экспедыцыі прыродазнаўца адаслаў узоры гэтых кветак у Еўропу, дзе яны паспяхова прыжыліся [5, с. 100]. З дапамогай мясцовых жыхароў Ельскі пастаянна пашыраў сваю калекцыю. Абарыгены навучылі яго вырабляць чучалы жывёл і птушак без гіпсу, крухмалу і паперы, што дазваляла ствараць іх хутчэй і больш якасна.

Даследаваўшы Гвіяну, апантаны натураліст у 1870-я гады перабіраецца праз Кардыльеры



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ў Панаму, дзе спачатку даследуе тэрыторыі на памежжы Перу і Эквадора, а потым – цяжкадаступныя рэгіёны вярхоўяў Амазонкі. Менавіта тут даследчык адкрывае невядомы да таго часу від млекапітаючай жывёлы Dinonys. Сабраныя ім калекцыі папоўнілі заалагічны сад і выставачныя залы Лімы. Найцікавейшую падрабязную інфармацыю аб тагачаснай Ліме ўтрымлівае навукова-папулярная праца К. Ельскага «Папулярна-прыродазнаўчыя апавяданні пра знаходжанне ў Гвіяне Французскай і асобных раёнах Перу», якая выйшла ў 1898 г. у Кракаве [5]. «Ліма, – пісаў вучоны, – адрозніваецца ад іншых паўднёваамерыканскіх гарадоў. Яна забудавана каменнымі дамамі, мае брукаваныя вуліцы, падземную каналізацыю і вадаправод. На вуліцах шмат майстэрняў рамеснікаў і лавак, якія гандлюць пераважна французскімі і англійскімі таварамі, шмат рэстаранаў і кандытарскіх. У танных сталоўках «фонда» і «пікантэрыях» прадаюцца кукурузнае піва «чыча», салат з ракаў, перцу і дробна нарэзанай сырой рыбы» [5, с. 161]. Ва ўзгаданай працы дадзена сацыяльная характарыстыка сталіцы, якую насялялі ў асноўным чарнаскурыя і самба (нашчадкі чарнаскурых і індзейцаў). Сямей еўрапейскага паходжання ў сталіцы Перу было вельмі мала. Са спачуваннем распавядаў наш зямляк аб кітайцах, якія займаліся гандлем ці працавалі ў маёнтках землеўладальнікаў. З гэтымі прадстаўнікамі манголоіднай расы абыходзіліся, як з рабамі. У адказ кітайцы часта бунтавалі і жорстка помсцілі сваім эксплуататарам. Яскрава анісваюцца ў кнізе нацыянальнае адзенне перуанцаў, іх побыт, абрады, этыкет.

У Перу К. Ельскі пражыў 10 гадоў. Увесь гэты час ён падтрымліваў цесныя сувязі з еўрапейскімі навуковымі арганізацыямі, музеямі, асобнымі вучонамі, выконваў іх заказы.

## Прызнаны вучоны

Нарэшце, праз 15 гадоў знаходжання ў Паўднёвай Амерыцы, у 1878 г. К. Ельскі вяртаецца ў Еўропу і назаўсёды са сваёй жонкай Аленай Корсак, выпускніцай Маскоўскай кансерваторыі, пасяляецца ў Кракаве. Тут Канстанцін Міхайлавіч працягвае займацца любімай справай.

Навуковая грамадскасць Еўропы высока ацаніла дзейнасць нашага суайчынніка па вывучэнні флоры і фауны паўночных раёнаў Паўднёваамерыканскага кантынента, дзе ён адкрыў шэраг раней невядомых відаў насякомых і жывёл. (Некаторыя з гэтых відаў носяць яго імя. Вучоныя свету дагэтуль выкарыстоўваюць сабраныя К. Ельскім калекцыі.) Канстанціна Міхайлавіча запрашаюць на працу ў Акадэмію навук Польшчы і прызначаюць на пасаду захавальніка прыродазнаўчых калекцый. Адначасова вучонага выбіраюць прафесарам заалогіі Вышэйшых жаночых курсаў Прамысловага музея імя Баранецкага. Тут Ельскі завяршае сваю грунтоўную працу «Аб узаемнай залежнасці геалагічных з'яў». Не перастае славуты даследчык ездзіць у экспедыцыі. Так, у 1886 і 1890 г. К. Ельскі здзейсніў геалагічныя падарожжы па Брэтані (Францыя) і Далмацыі. Свае назіранні і ўражанні, атрыманыя падчас навуковых экспедыцый па Паўднёвай Амерыцы, вучоны-натураліст занатаваў ва ўжо ўзгаданай намі працы «Папулярна-прыродазнаўчыя апавяданні пра знаходжанне ў Гвіяне Французскай і асобных раёнах Перу».

І жыццё, і навуковая дзейнасць Канстанціна Міхайлавіча Ельскага – яскравы прыклад штодзённага, сумленнага, апантанага служэння навуцы і ўсяму чалавецтву. Вандроўнік, урач, географ, геолаг, батанік, заолаг, К. Ельскі пакінуў прыкметны след у развіцці прыродазнаўства, праславіў свой род і сваю Айчыну.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Ермоленко, В.** Константин Михайлович Ельский / В. Ермоленко // Геаграфія: праблемы выкладання. – 1996. – № 4. – С. 101–104.
2. **Мазурмович, Б. М.** Вклад учених Київського університету у розвиток зоології у XIX і на початку XX ст. / Б. М. Мазурмович // Наукові записки Київського державного університету. – Київ, 1954. – Т. 13. – С. 34.
3. **Мальдзіс, А. І.** Бенядзікт Дыбоўскі / А. І. Мальдзіс // Падарожжа ў XIX стагоддзе. З гісторыі беларускай літаратуры, мастацтва і культуры: навук.-папул. нарыс. – Мінск: Народная асвета, 1969. – 204 с.
4. **Kozuchowski, J.** Kijowski okres (1856–1863) w zyciu Konstantego Jelskiego / J. Kozuchowski. – Wroclaw-Warszawa, 1961. – 96 s.
5. **Jelski, K.** Popularno-przyrodnicze opowiadania z pobytu w Gujanie francuzkiej i poczesci w Peru (od roku 1865-1871) / K. Jelski. – Krakow, 1898.
6. **Stolcman, J.** Konstanty Jelski. Wspomnienie posmiertne / J. Stolcman // Wszechswiat. – 1897. – T. 16. – № 1. – S. 1–37.



**Часопіс уключаны ў пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў.**

Падпісана да друку 16.03.2017. Папера газетная. Фармат 60x84 $^1/_8$. Гарнітура «Georgia». Друк афсетны.
Фіз. друк. арк. 12. Ум. друк. арк. 11,16. Ул.-выд. арк. 10,3. Тыраж 1572 экз. Зак. 728
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродка масавай інфармацыі №709 ад 30.07.2010, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Адрас рэдакцыі: 220023, Мінск, вул. Макаёнка, 12.
Афіцыйны сайт у Інтэрнэце www.n-asveta.by, адрас электроннай пошты info@n-asveta.by
Тэлефоны: 267-62-68, 267-64-69, 267-33-97.
Установа «Рэдакцыя газеты «Настаўніцкая газета» Філіял «Рэдакцыя часопіса «Народная асвета».
Падпісныя індэксы: 74967 (інд.); 749672 (вед.)

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку» (ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004).
220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ